**Латыши и белорусы: вместе сквозь века.** – 2019. – Вып. 8. – С. 54−64.

***ИСТОРИЯ***

# ЛАТЫШСКАЯ СЯМ'Я НА ВІЦЕБШЧЫНЕ Ў 1920-Я ГГ. ПРАЗ ПРЫЗМУ АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛОНІІ ВЫДРЭЯ)

## The Latvian family in Viciebsk region in 1920s on the basis of archival documents (Vydreya colony like an example)

**К. Карпекін (K. Karpekin),**
Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці
*г. Віцебск, Беларусь*

Статья посвящена особенностям латышской семьи в 1920-е гг. (на примере хутора Выдрея, деревень Малая Выдрея и Большая Выдрея, расположенных на территории Витебщины). Источниковедческой базой исследования являются документы Государственного архива Витебской области. В 1920-е гг. в населенных пунктах, в которых проживали латыши, они могли составлять как небольшой процент от общего количества населения (в 15%), так и значительную долю среди крестьян (примерно 80%). В латышской среде наиболее типичными были семьи из 3–6 членов, из которых совершеннолетними была примерно половина. Жизнь латышей неразрывным образом была связана с сельским хозяйством, являвшимся главным источником их доходов. В распоряжении всех латышских крестьян была пахота, луговые угодья, крупный рогатый скот. Кроме того, преобладающее большинство латышей имело сады, пасеки, держало коней и другую живность. В течение 1920-х гг. произошло некоторое перераспределение имущества: отдельные хозяйства обогащались за счет других. Также насущными вопросами латышского крестьянского быта являлись нехватка в ряде хозяйств рабочей силы, периодические неурожаи, ослабление хозяйства из-за обложения налогами.

*Ключевые слова*: колония Выдрея, Витебщина, латыши, налоги, повседневность, сельское хозяйство, семья.

The article is devoted to the peculiarities of the Latvian family in the 1920s (like an example of the village Vydreya, villages Little Vydreya and Big Vydreya, located on the territory of Viciebsk region). The source which study base are the documents from the State Archive of Viciebsk region. In the 1920s in the settlements where the Latvians lived, they could constitute both a small percent of the total population (15%) and a significant proportion among the peasants (approximately 80%). In the Latvian environment, the most typical were families from 3 till 6 members where about a half were adults. The daily life of Latvians was inextricably linked with agriculture, which was the main source of their revenue. All Latvian peasants had plowing, grasslands, and cattle. Also they have gardens, apiaries, horses and other animals. During the 1920s there was some redistribution of property between Latvian families. The vital issues of the Latvian country life were shortage in a number of farms of labor, periodic crop failures, weakening of economy because of taxation.

*Keywords*: Vydreya colony, Viciebsk region, Latvians, taxes, daily life, agriculture, family.

Адной з першых латышскіх калоній, узніклых на тэрыторыі беларускіх губерняў у выніку пошуку латышамі новых зямельных угоддзяў пасля адмены прыгоннага права, была Выдрэя Высачанскай воласці Аршанскага павета Магілёўскай губерні. Гэтае пасяленне ўтварылася ў 1871 г. і першапачаткова налічвала 46 двароў [23, с. 101]. У 1920-я гг. згаданы населены пункт уключаў у сябе цэлы шэраг пасяленняў. Статыстычныя,

уліковыя і картаграфічныя дакументы сведчаць пра тое, што яго структура была досыць складаная, альбо, верагодна, межы паміж пасяленнямі былі досыць умоўнымі. У прыватнасці, на тапаграфічнай карце 1920 г. пазначаны населены пункт Выдрэя, а таксама аднайменныя паўстанак і будка на чыгунцы (гл. малюнак) [22, арк. 101]. У спісах жыхароў Высачанскай воласці, якія мелі выбарчыя правы, за 1922 г. згадваюцца хутар Выдрэя, вёскі Малая і Вялікая Выдрэя [1, арк. 162–170]. У сваю чаргу спісы населеных пунктаў Лёзненскага і Высачанскага раёнаў за 1926–1927 гг. сведчаць пра тое, што існавалі Выдрэйскі Барак на чыгунцы, станцыя Выдрэя, вадакачка пры ёй, пасёлак Выдрэя і хутары Малая Выдрэя (Клімчанкі), Малая Выдрэя, Вялікая Выдрэя [2, арк. 2, 138]. Нарэшце, на карту, складзеную ў 1928–1929 гг., нанесены Малая і Вялікая Выдрэя, а таксама станцыя Выдрэя [3, арк. 133].



*Малюнак* – Фрагмент тапаграфічнай карты 1920 г.

Паводле справаводчых дакументаў, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, латышскае насельніцтва пражывала на хутары Выдрэя, у Малой і Вялікай Выдрэі. Гэтыя ж дакументы яскрава адлюстроўваюць структуру латышскіх сем’яў 1920-х гг., іх побыт, гаспадарчыя заняткі і надзённыя праблемы.

Як сведчаць спісы выбаршчыкаў у мясцовыя органы ўлады за 1922 г., найбольшы працэнт сярод усяго насельніцтва латышы складалі на хутары Выдрэя. Усяго ў гэты час тут пражывала 23 сям’і, з якіх латышскімі было 19 (83%). Усе яны былі не асабліва шматлікімі: у згаданых латышскіх сем’ях налічвалася 33 паўналетнія асобы. Пры гэтым у 47,4% сем’яў было толькі па 1 паўналетняму члену, у 42% – па 2, у 5,3% – па 3, і ў 5,3% сем’яў – па 5 паўналетніх членаў [1, арк. 162].

У Вялікай Выдрэі доля латышскіх сем’яў была значна меншая ў параўнанні з хутарам. У 1922 г. вёску насяляла 38 сем’яў, з якіх латышскімі з’яўляліся 16 (42%), затое яны былі больш шматлікімі: у суме ў іх налічвалася 34 паўналетнія члены. Найбольш распаўсюджанымі таксама з’яўляліся сем’і з 1 дарослым (было 6 такіх сем’яў), у той жа час з 2 дарослымі асобамі мелася 5 сем’яў, з 3 – 3 сям’і, з 4 і 5 дарослымі – па 1 сям’і [1, арк. 168 адв. – 170 адв.].

Нарэшце, у Малой Выдрэі ў 1922 г. жыла 41 сям’я, сярод якіх толькі 6 (альбо 15%) было латышскімі. Яны складаліся з 13 дарослых асоб: з 1 і 2 паўналетнімі членамі было па 2 сям’і, з 3 і 4 – па 1 [1, арк. 162 адв.–165].

На жаль, поўных звестак пра агульную колькасць асоб у латышскай сям’і (як паўналетніх, так і непаўналетніх) у 1920-я гг. не выяўлена. У пэўнай ступені пра гэтую з’яву можна меркаваць на падставе дакументаў па абкладанні дадатковым падаткам тых латышоў, якія карысталіся наёмнай працай. Так, напрыклад, у 1929 г. у Малой Выдрэі латышскія сем’і налічвалі ад 3 да 8 чалавек. Але найбольш тыповымі варта лічыць сем’і з 3–5 асоб, з якіх працаздольнымі з’яўляліся 2 ці 3 [5, арк. 2; 8, арк. 2; 9, арк. 2; 10, арк. 2; 11, арк. 2; 14, арк. 2; 15, арк. 2; 17, арк. 2; 19, арк. 2; 21, арк. 2].

У Вялікай Выдрэі сем’і латышоў налічвалі ад 3 да 11 асоб, пры чым у сем’ях з 3–6 чалавек налічвалася, як правіла, да 2 працаздольных, а ў сем’ях з 7–11 чалавек – ад 4 да 6 працаздольных [6, арк. 2; 7, арк. 2; 12, арк. 2; 13, арк. 3; 16, арк. 2; 18, арк. 3; 20, арк. 2].

Некаторыя латышскія сем’і былі няпоўнымі. Напрыклад, у 1929 г. сям’я Евы Карлаўны Гіпсліс з Малой Выдрэі складалася з самой 65-гадовай гаспадыні, яе 25-гадовай дачкі і 2-х малых унукаў [10, арк. 4 адв.].

Можна меркаваць, што ў 1920-я гг. у латышскім асяроддзі назіралася пэўная міграцыя, але яна была не асабліва актыўнай. У прыватнасці, дзеці і ўнукі Івана Ягоравіча Альсміка з Вялікай Выдрэі жылі ў РСФСР, і ў 1929 г. гаспадар жыў толькі з жонкай [6, арк. 3]. У тым жа годзе ў сям’і Аўгуста Іванавіча Акліса з Малой Выдрэі быў студэнт ВНУ, які на вакацыі прыязджаў у вёску і дапамагаў бацькам па гаспадарцы [5, арк. 6].

Жыццё латышоў было насычана разнастайнымі побытавымі клопатамі, у тым ліку канфліктамі паміж аднавяскоўцамі. Безумоўна, у архіўных крыніцах у большай ступені адлюстраваліся маёмасныя пытанні, якія патрабавалі фіксацыі ў афіцыйных дакументах. У прыватнасці, перад некаторымі жыхарамі латышскай калоніі востра стаяла жыллёвае пытанне. Так, у 1919 г. жыхар Выдрэі Андрэй Роод здаў у арэнду аднавяскоўцу Пятру Аболіну свой жылы дом тэрмінам на 3

гады, але нават пасля завяршэння гэтага часу арандатар працягваў жыць у доме, пры чым перастаў плаціць за карыстанне памяшканнем. Можна меркаваць, што ўласнага дома П. Аболін не меў [1, арк. 210].

Не лепшымі былі  ўмовы пражывання сям’і Вільгельма Іванавіча Мезака з Малой Выдрэі: у 1929 г. сяляне размяшчаліся ў старым напаўразбураным таку, бо новая хата не была дабудавана [15, арк. 3, 6].

Досыць распаўсюджанай з’явай у латышскім асяроддзі было заключэнне дамоў на сумеснае вядзенне гаспадаркі на пэўны сезон. Прычынай таму можна лічыць пэўнае маёмаснае расслаенне, недастатковую колькасць працоўнай сілы ў адных латышскіх сем’ях, а ў іншых – недахоп уласных зямельных угоддзяў. Падобныя дамовы рэгулявалі тэрмін выкарыстання палеткаў, размеркаванне сельскагаспадарчых работ, парадак падзелу ўраджаю. Латышы заключалі падобныя дамовы не толькі з іншымі латышамі, але і з беларускімі сялянамі (прыкладна ў аднолькавых суадносінах).

Так, ужо згаданы вышэй жыхар хутара Выдрэя Андрэй Роод запрасіў да сябе “палавіншчыка” Івана Апіна, які дапамагаў яму весці гаспадарку, але з цягам часу паміж сялянамі пачаліся сваркі – настолькі, што ў снежні 1922 г. у іх замірэнні прымала ўдзел камісія на чале са старшынём Сасноўскага раённага савета. У выніку нарыхтаванае сена было падзелена паміж гаспадарамі пароўну (з А. Роода спагналі 30 пудоў падатку, а з І. Апіна – 20 пудоў), а салома і мякіна цалкам дасталіся І. Апіну. Паколькі ён не лічыўся сярод жыхароў Выдрэі, то ў 7-дзённы тэрмін мусіў пакінуць хутар [1, арк. 246].

У 1921 г. іншы жыхар хутара Пётр Берзін вёў гаспадарку ўласнымі сіламі, але ў пачатку 1922 г. захварэў і быў вымушаны прасіць пра дапамогу Мікалая Цаліта. Ён заключыў з ім вусную дамову на тэрмін з 23 красавіка 1922 г. да 23 лютага 1923 г. Сутнасць яе была ў тым, што яравая сяўба 1922 г. будзе ажыццяўляцца насеннем П. Берзіна, а ў выпадку недахопу насення – М. Цаліта. Апошні таксама мусіў заплаціць харчпадатак, а затым размеркаваць насенне прапарцыянальна таму, як яно было затрачана пры сяўбе, а рэшткі падзяліць роўна папалам. Тым не менш, нават да канца 1922 г. М. Цаліт не заплаціў неабходны падатак. Таксама ён не выканаў дамову наконт догляду за будынкамі: калі ў адным з вокнаў жылога дома разбілася шкло, ён проста забіў яго дошкамі. Праўда, да снежня 1922 г. П. Берзін ужо выздаравеў і змог сам займацца уласнай гаспадаркай [1, арк. 202–203].

Аналагічнай была прычына заключэння дамовы паміж жыхарамі хутара Выдрэя Эммай Якаўлеўнай Азолінай і Міхаілам Іосіфавічам Брэшчанкам. Вясной 1923 г. сялянка захварэла, таму даверыла адна-

сяльчаніну цягам палявога сезону 1923 г. карыстацца адным з яе яравых палеткаў. М.І. Брэшчанка мусіў выкарыстоўваць сваё насенне, сельскагаспадарчы інвентар і жывёлу, але мог узяць аднаго каня Э. Азолінай, ён жа мусіў займацца і ўборкай ураджаю. Паводле дамовы, М.І. Брэшчанка вяртаў сабе зерне, затрачанае пры сяўбе, а астатні ўраджай жыта, салому і сена яны дзялілі пароўну [1, арк. 259].

Працягваў заключаць дамовы з аднавяскоўцамі Андрэй Роод, бо ён не меў сям'і, і ў яго не было дастаткова ўласных сельскагаспадарчых прылад. У 1923 г. ён дазволіў іншаму селяніну – Ігнату Хадаронку – карыстацца часткай сваіх палеткаў. У выніку апошні засеяў аўсом, ячменем і пшаніцай каля 1 дзес., выкасіў 2 дзес. сена, і потым склаў яго ў пуню А. Роода [1, арк. 268].

Можна меркаваць, што ў калоніі Выдрэя здараліся адзінкавыя выпадкі крадзяжоў. Да прыкладу, у 1923 г. у Давіда Пятровіча Гіпсліса невядомыя ўкралі збожжа, падрыхтаванае для сяўбы, а таксама каня і карову, а ў Пятра Андрэевіча Капмала – збожжа і санкі [1, арк. 298, 303]. Разам з тым, варта адзначыць, што гэтыя скаргі паступілі ў Сасноўскі райсавет у сувязі са спагнаннем з вышэйзгаданых сялян падаткаў, што ставіць пад некаторае сумненне іх праўдзівасць.

Падаткі сапраўды ў значнай ступені абцяжарвалі побыт латышскіх сялян. Так, са студзеня 1924 г. жыхар Вялікай Выдрэі Іван Марцінавіч Мезіт мусіў плаціць на мясцовыя патрэбы 20 капеек з кожнага пуда сабранага ўраджаю. Селянін заявіў, што не можа выплаціць такую суму, бо 1923 г. быў неўраджайным, сам ён хворы, а яго сям'я складаецца з 9 чалавек, з якіх, апроч гаспадара, працаздольныя толькі 2 жанчыны [1, арк. 280].

У падобнай сітуацыі апынуўся і Іван Какіт, якога ўвогуле абклалі падаткам у памеры 30 капеек з кожнага пуда. Спаслаўшыся на дрэнны ўраджай азімага жыта (палеткі знаходзіліся ў балоцістай мясцовасці) селянін заявіў, што можа заплаціць толькі 15 капеек з пуда [1, арк. 289].

Такая ж праблема існавала ў Пятра Андрэевіча Капмала, якому прызначылі падатак па 20 капеек з пуда збажыны. Селянін заявіў, што дзеля яго выплаты яму давядзецца прадаць карову, і прасіў знізіць памер выплат да 10 капеек [1, арк. 303].

Асноўнай крыніцай даходаў большасці выдрэйскіх сялян была сельская гаспадарка. Выключэнні былі адзінкавымі: напрыклад, адзін з латышоў хутара Выдрэя – Пётр Аболін – у 1919 г. працаваў фельчарам, іншы латышскі гаспадар у 1922 г. зарабляў кравецкай справай [1, арк. 162, 210], Вільгельм Іванавіч Мезак з Малой Выдрэі ў 1929 г. працаваў аграномам [15, арк. 3, 6].

Як сведчаць статыстычныя дадзеныя, у сярэдзіне 1920-х гг. латышскія сяляне Малой Выдрэі мелі зямельныя надзелы: ад 5 да 13,5 га ворыва (у сярэднім – па 9 га) і ад 2,5 да 11 га сенажаці (у сярэднім – па 6,6 га). Усе латышы трымалі кароў, у 85% гаспадарак былі ўласныя коні. У сярэднім статак буйной рагатай жывёлы налічваў па 4 асобіны, прыкладна ў 50% гаспадароў, якія трымалі коней, было па 1 каню, а ў астатніх 50% – па 2 (гл. табліцу 1).

*Табліца 1 – Гаспадарка сялян-латышоў в. Малая Выдрэя, 1924–1925 гг.*

| Імя гаспадара | Плошча (га) | | Колькасць | |
|---|---|---|---|---|
| | ворыва | луга | БРЖ | коней |
| Азоліна Эма Якаўлеўна | 7 | 6 | 2 | - |
| Вепер Петр Давыдавіч | 13 | 9,75 | 6 | 2 |
| Гіпсліс Давід Пятровіч | 6 | 3 | 2 | 1 |
| Донсцер Андрэй Якаўлевіч | 10 | 7,5 | 6 | 2 |
| Капмал Петр Андрэевіч | 11 | 9 | 5 | 1 |
| Лімберг Іван Марцінавіч | 7,12 | 7 | 5 | 1 |
| Мезак Вільгельм Іванавіч | 6 | 5,5 | 3 | 1 |
| Мезіт Іван Марцінавіч | 10 | 8 | 4 | 2 |
| Міллер Пётр Марцінавіч | 13,5 | 11 | 6 | 2 |
| Пецярсон Іван Пятровіч | 12 | 6 | 4 | 2 |
| Пурвін Петр Пятровіч | 5 | 2,5 | 2 | - |
| Роод Ліна Германаўна | 6,5 | 3,5 | 3 | 1 |
| Роод Павел Кірылавіч | 9,88 | 6,75 | 5 | 1 |

*Заўвага* – Табліца складзена аўтарам паводле [4, арк. 2–3].

*Табліца 2 – Гаспадарка сялян-латышоў в. Малая Выдрэя, 1929 г.*

| Імя гаспадара | Плошча (га) | | | | Колькасць | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ворыва | луга | сада | агарода | коней | быкоў | кароў | свіней | авечак, коз | вулляў |
| Акліс Аўгуст Іванавіч | 8,5 | 5,3 | 0,1 | - | 1 | - | 3 | - | 2 | - |
| Брэд Берта Андрэеўна | 15 | 16,5 | 0,75 | - | 2 | - | 7 | 3 | 6 | - |
| Веппер Пётр Давыдавіч | 11,25 | 8,25 | 0,15 | - | 1 | - | 4 | 2 | 5 | 6 |
| Гіпсліс Ева Карлаўна | 8,5 | 2 | 0,5 | - | 1 | - | 5 | - | 2 | - |
| Донсцер Андрэй Якаўлевіч | 9,65 | 7,5 | 0,75 | - | 2 | - | 4 | 3 | 2 | 1 |
| Лімберг Іван Марцінавіч | 9 | 6,5 | - | - | 1 | - | 4 | - | 4 | - |
| Мезак Вільгельм Іванавіч | 5,5 | 3,25 | 0,6 | - | 1 | - | 3 | - | 3 | - |
| Пецярсон Іван Пятровіч | 8 | 4,5 | 0,35 | - | 1 | - | 3 | 2 | 4 | 2 |
| Роод Ліна Германаўна | 14,77 | 2 | 0,5 | 0,02 | 2 | - | 2 | 1 | - | - |
| Свіклін Бернард Іванавіч | 13 | 5,5 | 0,05 | - | 1 | - | 4 | 2 | 5 | - |

*Заўвага* – Табліца складзена аўтарам паводле [5, арк. 2; 8, арк. 2; 9, арк. 2; 10, арк. 2; 11, арк. 2; 14, арк. 2; 15, арк. 2; 17, арк. 2; 19, арк. 2; 21, арк. 2].

Да 1929 г. сітуацыя змянілася наступным чынам: у сярэднім сяляне-латышы карысталіся надзеламі ворыва па 10,3 га, сенажаці – па 6,1 га, а ў іх статках па-ранейшаму налічвалася ў сярэднім па 4 каровы (гл. табліцу 2). З аднаго боку складваецца ўражанне, што да канца 1920-х гг. палеткі латышоў павялічыліся, але калі параўнаць стан канкрэтных гаспадарак ў 1924–1925 гг. і ў 1929 г., заўважальна агульная тэндэнцыя іх збяднення. Можна меркаваць, што на працягу другой паловы 1920-х гг. адбылося пэўнае пераразмеркаванне ўласнасці. Да таго ж варта адзначыць, што звесткі пра гаспадаркі латышоў у 1929 г. атрыманы са спраў па абкладанні падаткамі тых, хто карыстаўся наёмнай працай, таму варта лічыць, што ў свой час гэта былі найбольш заможныя сем'і.

Што тычыцца Вялікай Выдрэі, то ў 1924–1925 гг. памеры ворыўных надзелаў у латышскіх гаспадарках тут вагаліся ад 2 да 18 га (у сярэднім – 7 га), лугавых – ад 2 да 13,75 га (у сярэднім – 5,8 га). Тутэйшыя латышы ў сярэднім трымалі па 3–4 каровы, у 70% гаспадарак было па 1 кані (гл. табліцу 3). Іншымі словамі, у гэты час маёмасны стан латышоў Вялікай Выдрэі ў цэлым быў горшым у параўнанні з Малой Выдрэяй.

*Табліца 3 – Гаспадарка сялян-латышоў в. Вялікая Выдрэя, 1924–1925 гг.*

| Імя гаспадара | Плошча (га) | | Колькасць | |
|---|---|---|---|---|
| | ворыва | луга | БРЖ | коней |
| Аболін Пётр Раманавіч | 2 | 2 | 3 | 1 |
| Альсмік Аляксандр Іванавіч | 5,25 | 4,5 | 2 | 1 |
| Альсмік Іван Ягоравіч | 5,5 | 4,5 | 3 | 1 |
| Анж'ян Раман Іванавіч | 18 | 13,75 | 9 | 1 |
| Аўзін Раман Хрыстафоравіч | 11 | 5 | 4 | 2 |
| Какіт Іван Іванавіч | 12 | 5 | 8 | 1 |
| Какіт Пётр Іванавіч (разам з Сініцкім Паўлам Іванавічам) | 15,25 | 9 | 6 | 2 |
| Кюсэ Кірыл Іванавіч | 5,25 | 4,5 | 2 | - |
| Мезіт Аляксандр Марцінавіч | 3,5 | 3,5 | 2 | 1 |
| Мезіт Уладзімір Марцінавіч | 9 | 6 | 3 | 2 |
| Перкан Пётр Іванавіч | 7 | 7 | 4 | 1 |
| Прэйс Андрэй Янавіч | 5 | 3 | 2 | 1 |
| Прэйс Мікалай Іванавіч | 3,5 | 3,5 | 2 | 1 |
| Прэйс Пётр Іванавіч | 4 | 4 | 2 | 1 |
| Прэйс Хрысціна Кірылаўна | 4 | 4 | 2 | 1 |
| Скрытул Уладзімір Хрыстафоравіч | 9 | 15 | 6 | 2 |
| Узан Эрман Марцінавіч | 2,5 | 2 | 3 | 1 |
| Эгліт Карл Раманавіч | 4,25 | 8 | 4 | 1 |

*Заўвага* – Табліца складзена аўтарам паводле [4, арк. 9 адв. – 10 адв.].

Да 1929 г. памеры сярэдняга надзелу ворыва ў латышскіх гаспадарках Вялікай Выдрэі ўзраслі да 10,6 га, лугоў – да 7,4 га. Сярэдняя колькасць кароў засталася такой жа, а коней – павялічылася (гл. табліцу 4). Пры гэтым адносна канкрэтных гаспадарак назіраецца тэндэнцыя аналагічная той, што мела месца і ў Малой Выдрэі.

*Табліца 4 – Гаспадарка сялян-латышоў в. Вялікая Выдрэя, 1929 г.*

| Імя гаспадара | Плошча (га) | | | | Колькасць | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ворыва | луга | сада | агарода (пад карняплодамі) | коней | быкоў | кароў | свіней | авечак, коз | вулляў |
| Альсмік Іван Ягоравіч | 11,75 | 3,5 | 0,6 | - | 1 | - | 3 | 1 | 1 | - |
| Анж'ян Раман Іванавіч | 11 | 10 | 1,75 | 0,25 | 2 | - | 4 | 2 | 3 | 5 |
| Какіт Іван Іванавіч | 10 | 3,8 | 0,75 | - | 2 | - | 4 | 2 | - | - |
| Какіт Пётр Іванавіч | 16 | 7 | 0,8 | 0,2 | 2 | - | 5 | - | 4 | 2 |
| Мезіт Уладзімір Марцінавіч | 5,6 | 4,8 | 0,4 | 0,2 | 1 | - | 3 | 2 | 3 | 1 |
| Прэйс Пётр Іванавіч | 12,3 | 16 | 0,75 | 0,5 | 1 | - | 4 | 3 | 3 | 3 |
| Скрытул Уладзімір Хрыстафоравіч | 7,5 | 6,6 | 0,1 | - | 1 | - | 3 | - | - | - |

*Заўвага* – Табліца складзена аўтарам паводле [6, арк. 2; 7, арк. 2; 12, арк. 2; 13, арк. 3; 16, арк. 2; 18, арк. 3; 20, арк. 2].

У 1929 г. многія латышскія гаспадаркі былі абкладзены індывідуальным сельскагаспадарчым падаткам у сувязі з тым, што там выкарыстоўвалася пастаянная наёмная працоўная сіла. Дадатковыя грашовыя выплаты адмоўным чынам адбіваліся на маёмасным стане латышоў, таму пераважная большасць гаспадароў імкнулася прывесці аргументы ў сваё апраўданне, каб даказаць несправядлівасць падатка.

Напрыклад, Іван Іванавіч Какіт з Вялікай Выдрэі адзначыў, што запрашаў наёмных працаўнікоў выключна на сезонныя работы, бо ў яго сям'і не было працаздольных [12, арк. 3]. Яго аднавяскоўец Уладзімір Марцінавіч Мезіт тамсама зазначыў, што ўласна наёмнай працы не выкарыстоўваў – толькі ў 1929 г. запрашаў пастуха. Пры тым селянін заявіў, што яго гаспадарка не асабліва вялікая, таму сям'я спраўляецца ўласнымі сіламі [16, арк. 1]. Пётр Іванавіч Наўдзін з Малой Выдрэі не адмаўляў, што ў яго на працягу 68 дзён працавала служанка, бо ў сям'і працаздольным быў толькі сам гаспадар. Наём ён растлумачыў яшчэ і тым, што яго зямельны надзел быў няякасным – забалочаным і зарослым хмызнякамі, таму селянін штогод траціў значныя сродкі на меліярацыю. Больш за тое, у 1928–1929 гг. вымерзла частка

яго сада, і на садавіну зусім не было ўраджаю. Праз гэта гаспадар апынуўся ў складаных умовах, а падатак яшчэ больш пагоршыў яго становішча [17, арк. 3]. Пётр Іванавіч Прэйс у 1929 г. наймаў работніка па той прычыне, што раней яму дапамагаў па гаспадарцы родны брат, але яго прызвалі на службу ў Чырвоную Армію [18, арк. 5]. Падобная сітуацыя была і ва Уладзіміра Хрыстафоравіча Скрытула з Вялікай Выдрэі: у чэрвені 1929 г. яму прызначылі падатак, але ён патлумачыў, што яго сям'я наймала сезонных работнікаў выключна па прычыне таго, што ён служыў у Чырвонай Арміі, ды і не на працяглы тэрмін: 8 дзён на сенакос і 17 дзён на капанне бульбы [20, арк. 4–5].

Нягледзячы на масавае незадавальненне латышскіх сялян, амаль ніводнае з хадайніцтваў не было разгледжана мясцовымі ўладамі станоўча. Сярод пералічаных вышэй заяў мела поспех толькі адно: падатак з гаспадаркі У.Х. Скрытула быў адменены 18 ліпеня 1929 г. [20, арк. 5].

Пэўным чынам на становішча латышскай сям'і ў калоніі Выдрэя паўплывала і савецкая палітыка калектывізацыі. 31 снежня 1929 г. адбыўся агульны сход сялян, на якім была створана латышская нацыянальная сельскагаспадарчая камуна "Сацыялістычная Айчына". У яе сябры запісаліся сяляне з розных вёсак – з Малой і Вялікай Выдрэі, Забор'я, Рэчак, Лашнёва, Рамшына, Стажарышча (усяго – 26 сем'яў), але цэнтр камуны размяшчаўся ў Малой Выдрэі. Непасрэдна з Малой Выдрэі было 10 сямей (агульнай колькасцю 23 чалавека, 5 гаспадароў былі беззямельнымі, а 5 мелі 50,5 га зямлі). З Вялікай Выдрэі ў камуну ўступіла 2 сям'і агульным складам 9 асоб, якія ўсе разам мелі 14 га зямлі [24, арк. 6, 20–21]. Параўноўваючы сярэдні памер надзелаў гэтых сялян, можна зрабіць выснову, што у камуну першапачаткова ўступілі малазямельныя латышы.

Такім чынам, архіўныя дакументы сведчаць пра тое, што ў 1920-я гг. у населеных пунктах, дзе пражывалі латышы, яны маглі як складаць невялікі працэнт ад агульнай колькасці насельніцтва (у межах 15%), так і займаць значную долю сярод сялян (прыкладна да 80%). У латышскім асяроддзі найбольш тыповымі былі сем'і з 3–6 асоб, з якіх дарослымі былі каля паловы членаў. Жыццё латышоў непарыўным чынам было звязана з сельскай гаспадаркай, якая з'яўлялася галоўнай крыніцай іх даходаў. Ва ўсіх латышскіх сялян была ворыўная зямля, сенажаці, буйная рагатая жывёла. Апроч таго, пераважная большасць латышоў мела сады, пасекі, трымала коней і іншую жывёлу. На працягу 1920-х гг. адбылося пэўнае пераразмеркаванне маёмасці паміж латышскімі сем'ямі: асобныя гаспадаркі ўзбагачаліся за кошт іншых. Таксама надзённымі пытаннямі латышскага сялянскага побыту з'яўляліся недахоп працоўнай сілы, перыядычныя неўраджаі, аслабленне гаспадаркі праз неабходнасць выплаты падаткаў.

## **Выкарыстаныя крыніцы:**


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 73. Воп. 1. Спр. 21.
2. ДАВВ. Ф. 118. Воп. 1. Спр. 729.
3. ДАВВ. Ф. 160. Воп. 5. Спр. 3.
4. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 1. Спр. 169.
5. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 5.
6. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 8.
7. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 9.
8. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 30.
9. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 35.
10. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 44.
11. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 51.
12. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 76.
13. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 77.
14. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 108.
15. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 123.
16. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 124.
17. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 141.
18. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 148.
19. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 166.
20. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 171.
21. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 2. Спр. 243.
22. ДАВВ. Ф. 907. Воп. 1. Спр. 6.
23. Шилина, М. (перевод). Янис Драбанский: Латышские колонии в Беларуси / М. Шилина // Латыши и белорусы: вместе сквозь века : сб. науч. ст. Вып. 5 / редкол.: С.П. Кулик [и др.]. – Минск : РИВШ, 2016. – 99−106 с.
24. ДАВВ. Ф. 591. Воп. 1. Спр. 135.